Крэатыў

## Фільтруй кантэнт!

### VI фестываль медыяцыі для школьнікаў і студэнтаў прайшоў пад Мінскам

**Узаемаразуменне, пазітыўная камунікацыя і максімальна выгаднае для ўсіх вырашэнне канфліктных сітуацый — гэта далёка не ўсё, чаму можна навучыцца з дапамогай медыяцыі, упэўнены арганізатар фестывалю — Цэнтр «Медыяцыя і права». Сёлета галоўнай тэмай мерапрыемства, якое прайшло ў дзіцячым лагеры пад Ждановічамі, сталі «Канфлікты ў сеціве і магчымасці медыяцыі ў іх вырашэнні».**

Падчас двухдзённага мерапрыемства маладыя людзі слухалі лекцыі і ўдзельнічалі ў брыфінгу «Медыяцыя ў школе. Як яна працуе» (экспертамі тут, дарэчы, выступалі юныя медыятары, у школах якіх ужо створаны адпаведныя службы. Наведалі навукова-практычную канферэнцыю школьнікаў, студэнтаў і маладых вучоных «Медыяцыя як альтэрнатыўны спосаб бяспекі ў інтэрнэце», па выніках якой будзе выдадзены зборнік тэзісаў і дакладаў для электроннай бібліятэкі БДЭУ. Крэатывілі ў Майстэрні коміксаў, малюючы правілы паводзін у сеціве. На сабе апрабавалі такую тэхніку медыяцыі, як «кругі згуртавання», якая прымяняецца, калі ў канфлікце задзейнічана шмат людзей.

Медыятары гаварылі з падлеткамі пра значнасць медыяцыі ў крымінальным канфлікце, аб прымірэнні, раскаянні, прабачэнні. Дапамагалі моладзі паглядзець на медыяцыю як на рэсурс і для даравання (без чаго немагчыма цалкам вылечыцца ад траўмы, якую крыўдзіцель нанёс пацярпеламу), і для раскаяння і прыняцця адказнасці за здзейсненае.

Паводле задумкі арганізатараў, моладзь павінна разумець пад медыяцыяй не толькі магчымасць вырашыць канфлікт і памірыцца, але і разабрацца ў сабе і сваіх пачуццях. Удзельнікі фестывалю даведаліся, як фільтраваць кантэнт, каб ён быў бяспечны, як не паддавацца на правакацыю ў сеціве, як рэагаваць на кібербулінг і шмат што іншае.

*Падрабязней пра асаблівасці медыяцыі і тое, што адбывалася на фестывалі, мы абавязкова раскажам у адным з нумароў «СГ».*

**Ірына СІДАРОК.**

# З КІМ ЗАСТАНЕЦЦА ДЗІЦЯ?

## Двое разышліся, пытанні пачаліся...

**Скасаванне шлюбу цягне за сабой нямала складаных і неадназначных пытанняў. І, напэўна, самае балючае з іх — з кім будуць пражываць непаўналетнія дзеці пасля таго, як бацькі развядуцца. Аб тым, што кажа пра гэта закон і на чым баку будзе суд, мы спыталі ў адваката Мінскай абласной калегіі адвакатаў Алены ГРОНСКАЙ.**

Існуе меркаванне, што дзіця пасля разводу павінна пражываць з маці. Часцей за ўсё на практыцы так і здараецца. Але бываюць і іншыя сітуацыі. Калі бацька клапатлівы і любіць дзяцей, а маці вядзе асацыяльны лад жыцця і ўласнымі дзецьмі не цікавіцца — зразумела, дзеці будуць перададзены на выхаванне бацьку. Не зможа суд, згодна з законам, пакінуць непаўналетніх з тым з бацькоў, хто злоўжывае алкаголем або наркатычнымі рэчывамі, мае псіхічныя захворванні і з прычыны вышэйназванага не здольны забяспечыць належных ўмовы для росту і развіцця юнага чалавека. У гэтым выпадку дзіця можа быць перададзена па рашэнні суда другому з бацькоў.

### Дамовіцца — лепш

Юрысты адзначаюць, што ёсць пытанні, пра якія былым сужэнцам варта дамовіцца яшчэ да закачэння шлюбаразводнага працэсу. Першае і галоўнае якраз датычыцца месца пражывання дзяцей пасля разводу: з кім з бацькоў яны застануцца. Другое — правоў на ўдзел у выхаванні дзяцей таго з бацькоў, хто пражывае асобна. І, нарэшце, пытанне спагнання аліментаў: парадак і памер аліментаў рэкамендуецца абмеркаваць паміж сабой у спакойнай абстаноўцы, а не ў судовым парадку.

Бацькі маюць права заключыць Пагадненне аб дзецях або ўрэгуляваць пытанні выхавання дзяцей у Шлюбным дагаворы (найбольш рацыянальны і цывілізаваны шлях).

— Практычна ўсе пытанні пра дзяцей бацькі могуць вырашыць мірным шляхам, без звароту ў суд, — кажа адвакат Алена Гронская.

Але магчыма вырашэнне пытання пражывання дзяцей і ўдзелу ў выхаванні таго з бацькоў, хто пражывае асобна, у судовым парадку.

— Бацькі, якія пражываюць асобна, маюць права па ўзаемнай згодзе вызначыць месца жыхарства непаўналетняга дзіцяці (дзяцей), — тлумачыць адвакат. — У выпадку недасягнення згоды па пытанні месца жыхарства дзіцяці кожны з бацькоў мае права звярнуцца ў суд з іскам «Аб вызначэнні месца жыхарства дзіцяці».

### Правы — роўныя

Заканадаўствам Рэспублікі Беларусь прадугледжана роўнасць правоў і абавязкаў бацькоў у дачыненні да сваіх дзяцей. Правы дзіцяці і падставы іх узнікнення, прыярытэт правоў і законных інтарэсаў дзіцяці замацаваны Канстытуцыяй, Законам аб правах дзіцяці і нормамі Кодэкса аб шлюбе і сям'і.

— Правы дзяцей на клопат і ўвагу з боку маці і бацькі з'яўляецца роўным незалежна ад сумеснага або паасобнага пражывання бацькоў — гэтая норма замацавана ў ч. 2 арт. 185 Кодэкса аб шлюбе і сям'і, — падкрэслівае адвакат. — Бацькі карыстаюцца роўнымі правамі і нясуць роўныя абавязкі ў дачыненні да сваіх дзяцей і ў выпадку скасавання шлюбу паміж імі, калі іншае не прадугледжана ў Пагадненні аб дзецях, — дадае Алена Гронская.

> **«Улік меркавання дзіцяці, якое дасягнула 10 гадоў, абавязковы пры вынясенні рашэння па спрэчцы аб вызначэнні месца жыхарства непаўналетняга».**

Варта адзначыць, што калі бацькі пражываюць хоць і адасоблена, але па адным адрасе, спрэчка аб месцы жыхарства дзіцяці не ўзнікае, падкрэслівае адвакат. У такіх выпадках магчымыя спрэчкі — аб парадку ўдзелу бацькоў у выхаванні дзіцяці. Па спрэчках, звязаных з выхаваннем дзяцей, удзел у справе (судовым разглядзе) органа апекі і папячыцельства з'яўляецца абавязковым. Ён можа выступаць як дзяржаўны орган, упаўнаважаны даць заключэнне па справе.

— Заключэнне органа апекі і папячыцельства складаецца ў выглядзе асобнага дакумента на падставе актаў абследавання і павінна ўяўляць сабой падрабязны аналіз усіх абставін, якія датычацца ўмоў жыцця дзіцяці і яго ўзаемаадносін з асобамі, якія прэтэндуюць на яго выхаванне, і ўтрымліваць выснову па сутнасці спрэчкі. Заключэнне падпісваецца ўпаўнаважанай службовай асобай упраўлення (аддзела) адукацыі раённага, гарадскога выканаўчага камітэта і мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе. Нязгода з заключэннем органа апекі і папячыцельства павінна быць выкладзена ў матывацыйнай частцы рашэння ў выпадку яе складання.



Вырашаючы спрэчку аб месцы жыхарства дзіцяці пры асобным (па розных адрасах) пражыванні бацькоў (незалежна ад таго, ці знаходзяцца яны ў шлюбе), суд прымае пад увагу мноства абставін, адзначае адвакат.

— Гэта ўзрост дзіцяці, яго прыхільнасць да кожнага з бацькоў, братоў, сясцёр, іншых членаў сям'і, маральныя і іншыя якасці бацькоў, адносіны, якія склаліся паміж кожным з бацькоў і дзіцем, ступень клопату і ўвагі, якія праяўляюцца да дзіцяці з боку бацькоў з улікам іх роду дзейнасці, рэжыму працы, іншых умоў жыцця, магчымасць забеспячэння кожным з іх належных матэрыяльна-бытавых умоў для выхавання і развіцця дзіцяці, а таксама іншыя абставіны, якія склаліся ў месцы пражывання кожнага з бацькоў.

Суд улічвае таксама магчымасць стварэння належнай маральна-псіхалагічнай атмасферы вакол юнага чалавека. Дарэчы, перавага ў матэрыяльна-бытавым становішчы аднаго з бацькоў сама па сабе не з'яўляецца безумоўнай падставай для перадачы яму дзіцяці на выхаванне.

### Самы важны голас

Заканадаўства зыходзіць са статусу дзіцяці як самастойнага суб'екта праваадносін. І ўлік меркавання дзіцяці, якое дасягнула 10 гадоў, абавязковы пры вынясенні рашэння па спрэчцы аб вызначэнні месца жыхарства непаўналетняга, падкрэслівае Алена Гронская.

— Пункт 11 пастановы Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 30 верасня 2004 г. № 11 «Аб практыцы разгляду судамі спрэчак, звязаных з выхаваннем дзяцей» абвяшчае: судам належыць мець на ўвазе, што дзіця, якое дасягнула дзесяці гадоў, мае права само выбраць, з кім з бацькоў яно будзе пражываць.

Але ёсць выключэнне: калі жаданне дзіцяці пражываць з адным з бацькоў супярэчыць яго інтарэсам. Бо далёка не заўсёды юны чалавек можа ацаніць падзеі і іх наступствы ў перспектыве.

— Меркаванне дзіцяці і прадстаўленая яму магчымасць асабістага ўдзелу ва ўстаноўленых законам выпадках і формах пры ажыццяўленні судовага разбору маюць асаблівую значнасць для законнага і абгрунтаванага вырашэння спрэчкі аб вызначэнні месца жыхарства, — падкрэслівае адвакат. — Дзеці маюць права на асаблівы, пераважны і першачарговы клопат як з боку бацькоў, так і з боку дзяржавы, які неабходны для іх дабрабыту і гарманічнага развіцця. Таму пры разглядзе спрэчак, звязаных з выхаваннем непаўналетніх, суды выносяць рашэнні ў мэтах максімальнай абароны правоў і інтарэсаў дзяцей, стварэння ім найлепшых умоў для росту і развіцця.

> **Дзіця, што дасягнула 14 гадоў, можа звярнуцца ў суд самастойна, калі, напрыклад, адзін з бацькоў перашкаджае яго зносінам з іншым.**

Вырашаючы спрэчку, звязаную з месцам жыхарства дзіцяці, суд мае права разгледзець і патрабаванні аб спагнанні аліментаў.

— Трэба ўлічваць, што праваадносіны паміж бацькамі па пытаннях, звязаных з выхаваннем дзяцей, з'яўляюцца доўгатэрміновымі, таму наяўнасць рашэння суда не з'яўляецца перашкодай для ўзбуджэння новай справы паміж тымі ж бакамі і аб тым жа прадмеце, калі змяніліся абставіны, на якіх заснавана рашэнне.

Меркаванне дзіцяці аб тым, з кім з бацькоў яно хоча пражываць, па запыце суда выяўляецца органам апекі і папячыцельства па месцы жыхарства дзіцяці.

— У адпаведнасці з падпунктам 8-2.5. п. 8 Палажэння аб органах апекі і папячыцельства, меркаванне дзіцяці па запыце суда па ўсіх спрэчках, якія закранаюць яго правы і законныя інтарэсы, даручаецца выяўляць сацыяльна-педагагічным цэнтрам. Жаданне дзіцяці аб тым, з кім з бацькоў ён будзе пражываць, пры неабходнасці можа быць таксама высветлена і судом як у працэсе падрыхтоўкі справы да судовага разбору, так і ў ходзе судовага пасяджэння шляхам асабістай гутаркі ў прысутнасці педагога. Пры гэтым вызначаецца, ці з'яўляецца жаданне дзіцяці шчырым, да каго з бацькоў яно больш прывязана, ці не аказвалася на яго ўздзеянне з боку аднаго з бацькоў або іншых асоб (дзеда, бабулі, старэйшых братоў і сясцёр, іншых сваякоў і зацікаўленых асоб) і г. д. Даведка аб выніках гутаркі складаецца суддзёй і далучаецца да матэрыялаў справы.

І яшчэ адзін нюанс: у адпаведнасці з законам, дзіця, што дасягнула 14 гадоў, можа звярнуцца ў суд самастойна, калі, напрыклад, адзін з бацькоў перашкаджае яго зносінам з іншым, ужываючы сілавыя метады ўздзеяння на непаўналетняга.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

### ШТО КАЖУЦЬ ПСІХОЛАГІ

Тут можа ўзнікнуць пытанне: чаму дзіця ўдзельнічае ў прыняцці рашэння, з кім пражываць, толькі калі яму 10 і больш гадоў? А калі яно маладзейшае, яго ўплыў на гэтае пытанне — толькі апасродкаваны і не настолькі значны? Дзіцячыя псіхолагі адзначаюць, што чым меншыя дзеці, тым больш яны схільныя да эмацыянальных і спантанных рашэнняў. Практыка паказвае, што з прычыны яшчэ неакрэплай псіхікі малыя здольныя мяняць сваё меркаванне па некалькі разоў на дзень, а само па сабе прыняцце канчатковага рашэння становіцца для іх моцным стрэсам. Закон жа імкнецца абараніць правы дзіцяці — часам нават ад яго самога. Таму тое, што кажа малы, важна ацэньваць рацыянальна. Тым больш што да 10 гадоў дзеці схільныя «адлюстроўваць» значных дарослых — у першую чаргу бацькоў. Калі мама негатыўна і эмацыянальна выказваецца пра тату, то і дзіця ўстане на такую пазіцыю. А сустрэўшыся з татам і заўважыўшы, што негатыўных выказванні пра маму радуюць бацьку, дзіця мяняе свае выказванні на дыяметральна супрацьлеглыя. У гэтай сітуацыі бацькам важна ўстрымацца ад рэзкіх заўваг і крытыкі ў дачыненні да былой «другой паловы» ў прысутнасці дзяцей і, вядома, спецыяльна не настройваць непаўналетніх супраць бацькі або маці. Важна разумець, што гэта ўзмацняе стрэс дзіцяці і негатыўна ўплывае на яго псіхалагічны стан, самаацэнку і далейшае развіццё. У канчатковым выніку ў бацькоў і заканадаўцаў адна мэта: абараніць юнага чалавека, які апынуўся ў няпростай жыццёвай сітуацыі. Бо калі разбураецца сям'я, яе абломкі балюча раняць не толькі дваіх, якія вырашылі разысціся, але і ў першую чаргу іх агульных дзяцей.